

КЛІМАВІЦКАЯ ІНФА-ПАНАРАМА

№12(88)

20 ліпеня 2012 Клімавіцкі грамадска-палітычны бюлетэнь

МНОГО ХОРОШЕГО ВСЕМ И КАЖДОМУ

Сергей АРЖАНЦЕВ

Совсем скоро, меньше чем через два месяца, в стране будут проходить парламентские выборы. И опять перед избирателями встанет один и тот же неизменный вопрос — кого мы выбираем и для чего участвуем в выборах? Более чем очевидно, что власть много лет действует по одному и тому же сценарию, а депутатский мандат каждый раз получают «свои» люди. Четыре года назад «своим» человеком стала депутат Белкина, выбранная в парламент от нашего округа. Помнит ли кто сейчас, что тогда по официальным данным за неё проголосовало 80% избирателей? Но давайте всё-таки вспомним, как это было в 2008 году. Это необходимо, чтобы понять простую истину — за четыре прошедших года ничего не изменилось. Давно пора спросить себя, нужны ли нам такие выборы?



МНОГО ХОРОШЕГО ВСЕМ И КАЖДОМУ

(опубликовано в независимой кричевской газете «Вольны Горад» в 2008 году)


Выборы состоялись и у климовичских избирателей появился в парламенте новый депутат. Это Тамара Белкина, избрание которой предсказывали с самого начала, чуть ли не с первых упоминаний её фамилии в досужих разговорах. «Вы слышали, у нас в депутаты идёт Белкина. Сама из Минска, из администрации президента, она будет вместо Симирского». Так или примерно так обсуждали горожане новость о выдвижении трудовыми коллективами района Т.А. Белкиной. Все прекрасно понимали, что выдвигают именно тех, кто потом становится депутатом. Да и ради чего, спрашивается, ехать сюда из столицы, не для того же, чтобы воочию убедиться в существовании избирательного округа №83?

Разумеется, Тамара Белкина абсолютно не собиралась «вхолостую» ездить через полстраны, а, наоборот, самым серьёзным образом намеревалась покорить местных избирателей. И она их покорила, что тут скрывать и темнить. В едином порыве, дружным и подавляющим большинством, избиратели наделили Тамару Алексеевну правом представлять их интересы в парламенте. Так, во всяком случае, свидетельствуют официальные результаты голосования, заверенные членами окружной комиссии. А это вам не какие-нибудь досужие разговоры на лавочке возле подъезда.

Конечно, по-хорошему следовало бы поздравить новоиспеченного депутата. Но мы решили оставить поздравления другим. Лучше напомним о том, что предлагалось осуществить в предвыборной программе столичной гостьи. Наобещано избирателям более чем достаточно. Перечень посулов обширный, хотя программа и заканчивается уверением «Я не умею много обещать». Вас, к примеру, волнуют получаемые доходы? Успокойтесь, Тамара Белкина выступает «за достойную зарплату работникам всех отраслей народного хозяйства». Может, у ваших детей-студентов проблемы с трудоустройством? Так ничего страшного, депутат выступает «за гарантии для каждого молодого человека на получение первого рабочего места». Правда, нынешние гарантии — это не что иное, как принудительное распределение с обязательной отработкой. А если нелады со здоровьем? Предусмотрено и это: «За бесплатное, доступное и качественное здравоохранение для всех людей». Одно плохо, что никак не удаётся совместить это одновременно. Сейчас у нас здравоохранение существует в трёх видах. Или бесплатное и доступное, но не качественное, или доступное и качественное, но не бесплатное, или качественное и бесплатное, но, к сожалению, вовсе не доступное «для всех людей».

Ну и также помимо всего вышеперечисленного Тамара Алексеевна обещает благодарным избирателям пенсии и детские пособия, контроль над чиновниками и бюджетными расходами, содействие предпринимательству и малому бизнесу, ремонт жилья и телефонизацию, чистую питьевую воду и постоянный приём граждан. Да мало ли ещё чего. Ведь она не скрывает: «я умею делать много хорошего…могу и знаю, как сделать ещё лучшей и обеспеченней нашу жизнь».

Ну прямо гора с плеч свалилась, повезло то как…



АФІЦЭР МІЛІЦЫІ З ГРОДНА ПАПРАСІЎ ПРЫТУЛКУ НА ЗАХАДЗЕ

Любоў ЛУНЁВА, Народная воля

Начальства Сяргея Макара, магчыма, яшчэ не ведае, што падначалены больш не вернецца на службу. Апошні раз ён быў у сваім службовым кабінеце ў чацвер 12 ліпеня. Што прымусіла афіцэра, які верай і праўдай праслужыў у АМАПе і аддзеле міліцыі 15 гадоў, усё кінуць і з'ехаць?



Пасля гутаркі з міліцыянерам стала зразумела, што прэзідэнцкія выбары ў нашай краіне адбіваюцца не толькі на лёсах апазіцыянераў, але і тых, на каго б мы падумалі ў апошнюю чаргу. Сяргей Макар адчуў на сабе ціск з боку спецслужб восенню 2006 года. Тады да яго прыйшлі двое. Адзін прадставіўся супрацоўнікам КДБ, другі моўчкі слухаў, назіраў і не сказаў ні слова. Сяргей Макар прыгадвае:

— Мой брат Ігар служыў у «Алмазе». Ён адразу пасля выбараў быў вымушаны хавацца, каб ураТаваць сваё жыццё. Рэч у тым, што ён не выканаў загады міністра Навумава па кампраметацыі Аляксандра Казуліна як кандыдата на пасаду прэзідэнта. Пасля гэтага Ігар даведаўся, што група, камандзірам якой ён быў, атрымала загад наконт яго самога. Не выключана, што гэта магло азначаць нават банальнае забойства. Прынамсі былым падначаленым Ігара сказалі, што выкананне загаду стане для іх сапраўднай праверкай. І так апрацавалі, што толькі адзін з усіх за некалькі хвілін пазваніў Ігару і крыкнуў: «Не ідзі туды, дзе цябе чакаюць!» Магчыма, дзякуючы гэтаму Ігар сёння жывы. Мне прапанавалі выклікаць у краіну брата на любой падставе. Яны разлічвалі з маёй дапамогай завабіць яго ў пастку. Натуральна, я катэгарычна адмовіўся, і тады мне паабяцалі праблемы па службе. Яны не прымусілі сябе чакаць. Мяне ў спакоі не пакінулі, сустракаліся яшчэ некалькі разоў… Потым узяліся за сястру. Неяк Вольгу прывезлі ў аддзел міліцыі, абражалі, здзекаваліся з яе, пагражалі, што з яе дзіцем нешта здарыцца. Доўжылася гэта некалькі гадзін.

— А Вы не маглі ўмяшацца? Вы ж працавалі ў тым аддзеле.

— Мяне тады не было ў аддзеле, я нічога не ведаў. Але вы думаеце, што ўмяшацца ўвогуле ў нешта магчыма? Вы не ведаеце, да якой ступені ўсё дэградавала.

Я спрабаваў умяшацца ў адну падобную сітуацыю. Нядаўна было. Прыйшоў у аддзел, гляджу — за шклянымі дзвярыма ў дзяжурнай частцы плача голая жанчына. Уся скруцілася, каб прыкрыцца… Высветлілася, што яна ішла з працы і ўбачыла на зямлі мужчыну. Той прасіў дапамагчы яму падняцца. Яна толькі падышла да яго, як побач спынілася машына з ППСнікамі. А ў іх план па п'яніцах. Яны схапілі і мужчыну, і гэтую маладую жанчыну. Мужчыну накіравалі ў выцвярэзнік, але і на яе склалі пратакол, што была п'яная і лаялася матам. Яна падпісваць паперы адмовілася. Вось тады яе раздзелі, збілі і пасадзілі ў пакой з празрыстымі дзвярыма. Я зняў гэта на відэа, падышоў да дзяжурнага: «Ты не бачыш, што ў цябе жанчына голая? Што тут адбываецца?» А ён: «А што я магу зрабіць? Ёсць старшы афіцэр, і ён гэтым займаецца». Вакол былі адны мужчыны, і ніхто нават не паспрабаваў умяшацца. Потым гэтую жанчыну даставілі ў суд. А суд яе, як ні дзіўна, апраўдаў.

— Гэта адзінкавы выпадак ці такое часта здараецца?

— Гэтая карціна адлюстроўвае сітуацыю ва ўсёй сістэме. Ілжывыя пратаколы, ілжэсведчанні ў судах… Усё стала магчымым пасля таго, як міліцыя паступова перастала выконваць сваю асноўную функцыю і занялася палітычным вышукам, каб абслугоўваць рэжым. А для гэтага ўсе сродкі апраўданыя. Фальсіфікацыі, якія адбываюцца на выбарах, далі глебу для хлусні ва ўсіх сферах.

— Вы былі сведкам такіх фактаў падчас выбараў?

— Мяне задзейнічалі на выбарах і ў 2006, і ў 2010. У 2006 я быў на закрытым участку ў вайсковай часці. У першы дзень датэрміновага галасавання салдаты ішлі калонай па адным з ужо запоўненымі бюлетэнямі. Кідалі іх у скрыню, а потым распісваліся ў журнале. У 2010 я працаваў на ўчастку ў гандлёвым каледжы. Там студэнтаў адміністрацыя па раскладзе прыводзіла галасаваць датэрмінова, каб потым адпусціць на выходныя. Скрыню з бюлетэнямі на ноч забіралі некуды ў асобны пакой. Але была яшчэ маленькая скрыня, яе вазілі да інвалідаў. Ніхто з тых, да каго мы прыходзілі, не хацеў галасаваць за Лукашэнку. Людзі казалі: «Не, ужо хопіць!» І ўвогуле абураліся, казалі, што жыццё стала значна горш. Але так здарылася, што на гэтым участку жыве шмат інвалідаў па зроку. Чальцы камісіі за іх запаўнялі бюлетэні і, не зважаючы на тое, за каго чалавек прасіў прагаласаваць, ставілі «галачку» Аляксандру Лукашэнку.

— А самі супрацоўнікі міліцыі давяраюць уладам?

— Супрацоўнікі праваахоўных органаў лепш, чым хто-кольвек, ведаюць рэальную цану заявам. І пра тую ці іншую элегантную перамогу на выбарах, і па гучных справах. Пасля выбуху ў мінскім метро ўсе, зразумела, абмяркоўвалі гэтую тэму. І я асабіста не ведаю ніводнага супрацоўніка, які б паверыў у вінаватасць расстраляных Кавалёва і Канавалава.

— Тым не менш, Вы служыце ў праваахоўных органах і маеце ўзнагароды.

— Я служыў 15 гадоў. Спачатку ў АМАПе, потым у аддзеле міліцыі Кастрычніцкага раёна Гродна. Я заўжды імкнуўся быць прыкладам для сваіх саслужыўцаў, заўжды быў наперадзе. Але за апошнія гады так упаў аўтарытэт сілавых структур, што некаторым сорамна прызнавацца, дзе яны працуюць.

Самае непрыемнае, што міліцыю прымусілі займацца неўласцівай ёй функцыяй — палітычным вышукам. У маім Кастрычніцкім раёне створаная база са звесткамі пра 79 чалавек, што нелаяльна ставяцца да ўлады, іх узрост ад 14 да 45 гадоў. Гэта людзі, якіх заўважылі некалі на апазіцыйных акцыях. Перад акцыямі іх трэба наведаць, узяць распіскі, што яны папярэджаныя і не будуць хадзіць на тое ці іншае вулічнае мерапрыемства. Натуральна, што не сама міліцыя ініцыюе ўсё гэта. Гэта брыдка. Менавіта апошнім часам я пачаў задумвацца пра сваю ролю ў гэтай сістэме. Канечне, можна было б ціха даслужыцца да пенсіі і звольніцца. Але гэта азначае зноў удзельнічаць у фальсіфікацыях, у розных гнюсных справах. Не хачу.

…Капітан міліцыі Сяргей Макар ужо двое сутак знаходзіцца за мяжой. Ён патлумачыў, што вымушаны быў з'ехаць з меркаванняў асабістай бяспекі.



СПРАВИЛИСЬ БЕЗ МИЛИЦИИ

Михаил ПЕТРОВ

В прошлом номере «Клімавіцкай Інфа-Панарамы» сообщалось о том, что жители деревни Павловичи передали в райисполком новое обращение. В этот раз подписи собирались за ремонт улиц и уличного освещения. Напомним, что ранее климовичские власти восприняли общественную инициативу, мягко говоря, без одобрения. Тогда в деревню приехали милиционеры и три дня опрашивали всех подписавшихся. Поэтому главная интрига была в том, как поведут себя чиновники на этот раз…

Впрочем, ожидать повторения милицейского десанта не приходилось. Во-первых, в Павловичах не нашлось людей, готовых пойти на попятный при отстаивании своих и общественных интересов. Так что вторично привлекать милицию к якобы проверке подписей попросту не имело смысла. А главное, в райисполкоме всё-таки признали очевидное и приняли решение действовать более цивилизованными методами. На осознание этой немудреной истины повлияли, видимо, и приближающиеся парламентские выборы. В такой момент обострять отношения с избирателями просто неразумно.

Так или иначе, но через несколько дней после подачи обращения в Павловичи приехала дорожно-строительная техника. А чуть позже, в установленные законом сроки, пришёл официальный ответ. Публикуем его, чтобы ознакомить с ним наших читателей и показать, что для того, чтобы что-то получить, нужно вначале что-то сделать.

«Климовичский районный исполнительный комитет по коллективному обращению жителей деревни Павловичи по вопросу неудовлетворительного состояния дорог по улицам Набережная и Школьная в деревне Павловичи, а также ремонта уличного освещения по улицам Трудовая и Набережная в деревне Павловичи сообщает.

Ямочный ремонт дороги по улице Центральная в деревне Павловичи произведён. Подсыпка и грейдирование дороги по улице Колхозная выполнены. По улице Набережная произведены частичная подсыпка дороги песчано-гравийной смесью в местах повреждения и грейдирование данной дороги. Дорога по улице Молодёжная находится в удовлетворительном состоянии, в подсыпке не нуждается, грейдирование произведено. Дороги по улице Трудовая и улице Школьная — в асфальтобетонном исполнении, находятся в удовлетворительном состоянии. Уличное освещение по улицам Трудовая и Набережная в деревне Павловичи отремонтировано.

Заместитель председателя райисполкома А.В. Шапкин»

СОЦИАЛЬНЫЕ СЕТИ — КЛИМОВИЧСКИЙ ВАРИАНТ

Сергей АРЖАНЦЕВ

Группы по интересам и различные сообщества в интернете существуют давно. Особенно часто встречаются так называемые виртуальные землячества, когда сообщество объединяет представителей конкретной местности или территории. Нужно признать, что климовчане быстро освоили все удобства и преимущества всемирной паутины. В настоящее время они активно развивают сразу несколько социальных сетей.

Но рассказать сегодня хочется конкретно об одной из них. Это относительно недавно организованное сообщество, группа "Вконтакте" Я ЛЮБЛЮ КЛИМОВИЧИ. Найти группу можно по адресу http://vk.com/iloveklimovichi

Впервые зашедших к ним встречает фраза: «Ты Из Климович? Или просто любишь этот город? ТЕБЕ СЮДА». Помимо знакомства с всевозможной информацией, здесь предлагаются новости, фотоотчёты, интересные перепечатки. Особенно удобно то, что прямо отсюда можно перейти на странички подобных сообществ из других районов Могилёвщины. Поэтому все они могут одновременно принимать участие в опросах на ту или иную тему, что делает полученные ответы намного достовернее и результативнее. Часть опросов проводится только для жителей Климовичского района. Заданная модератором тема может быть самой разнообразной.

Например, в июне участники группы отвечали на такой вопрос: «Достаточно ли в Климовичах детских площадок?». Из 108 проголосовавших человек только 8 (7,4%) ответило, что да, хватает. А вот 63 человека (58,3%) считает, что таких площадок недостаточно, ещё 27 (25%) уверенно, что их вообще нет.

Привлёк наше внимание и майский опрос «Стоит ли уезжать из Климович?». Всего проголосовало 118 участников. Вот их ответы, отражающие как настоящее, так и потенциальное будущее нашего города. «Да! Уже уехал» — 26 ответов (22%), «Если будет возможность — уеду» — 48 (40,7%), «Навряд ли уеду» — 15 (12,7%), «Не уеду ни за какие коврижки» — 18 (15,3%), «Планирую переехать в Климовичи» — 6 (5,1%), «Свой вариант в комментариях» — 5 (4,2%).

Кто знает, может для того, чтобы точно понять, любишь ли ты свой город, следует посетить виртуальную группу "Вконтакте" Я ЛЮБЛЮ КЛИМОВИЧИ.





НУЖНО ГОТОВИТЬСЯ К ОЧЕРЕДНОМУ ФИНАНСОВОМУ ОБВАЛУ

Александр ВЛАД

Один экономист смог довольно образно объяснить, почему коммунистическая система проиграла экономическое соревнование с капитализмом. По его словам, в СССР не было зарплат в точном понимании этого слова. Советские граждане ждали в конце месяца не зарплату, а получку. Деньги не зарабатывались, их получали от государства. Соответственно, у людей отсутствовали стимулы к развитию, система загнивала, что и вылилось, в конце концов, в махровый застой брежневизма.

То же самое происходит сейчас в современной Беларуси. Но наши белорусские получки отличаются, кроме всего прочего, тем, что люди не верят и в сам белорусский рубль. Советские рубли всё-таки чего-то стоили, а доверие к белорусскому рублю серьёзно подорвано. Достаточно сказать, что в структуре банковских вкладов (рублёвых и валютных) на валютные вклады приходится сегодня две трети депозитов. Несколько лет назад это соотношение было обратным — 60% вкладов держалось в рублях. К тому же доверчивых вкладчиков, верящих в устойчивость государственных финансов, становится всё меньше. Люди забирают свои денежные накопления, так как больше не верят в способность государства сохранить их.

Бывших вкладчиков можно понять, ведь расходы на жизнь становятся всё более обременительными. Сейчас три четверти организаций, которых учитывает официальная статистика, имеют зарплату до 3 млн. рублей. Наиболее распространённая зарплата в регионах — 2-2,5 млн. рублей. К тому же в реальном выражении эти номинальные миллионы по сравнению с прошлым годом даже «усохли». Как свидетельствуют данные Белстата, за январь-май текущего года только в четырёх районах Могилёвской области реальная зарплата осталась на прошлогоднем уровне. Во всех остальных районах по сравнению с аналогичным периодом прошлого года она снизилась.

В связи с этим отметим, что на днях портал interfax.by проанализировал последние предложения, размещенные в Общереспубликанском банке вакансий. В июле месяце из почти 29 тыс. вакансий только в 11 указана зарплата не менее $1 тыс. Это около 0,04% от общего числа. «Знаковые» $500 и больше в качестве зарплаты предлагаются в 788 вакансиях (2,7%). В то же время число вакансий с зарплатой до $200 составляет более 36% от общего количества. А в регионах, говоря проще, в глубинке положение намного хуже. К примеру, в Климовичском районе по состоянию на 5 июля подавляющая часть имеющихся свободных вакансий (130 из 163 вакансий) предусматривает зарплату до двух млн. руб. А каждая четвёртая — в пределах полтора миллиона рублей!

Неужто власти, вновь взявшие на вооружение лозунг о достижении 500-долларовой зарплаты, не знают этого? Можно не сомневаться, что в ситуации они разбираются и соответствующей информацией владеют. Поэтому, прекрасно понимая, что обещанных в преддверии выборов высоких зарплат наша экономика дать не в состоянии, Правительство вновь запустило печатный станок. Всего за полгода общая денежная масса в Беларуси выросла до 134 триллионов рублей (рост почти на 21%), а объём наличных денег в обращении увеличился за то же время на 41%. Это означает, что в ближайшем будущем белорусское общество будет вынуждено снова пережить очередной финансовый обвал, всплеск цен и ещё большее обнищание. К сожалению, будет именно так, и не говорите потом, что вас не предупреждали.

СТАЛИ ЛИ БЕЛОРУСЫ ЖИТЬ ЛУЧШЕ, ЧЕМ В 2009 ГОДУ?

Если судить по выступлениям различных официальных лиц, то экономический рост на протяжении последних лет трёх был просто ошеломительным. Рос ВВП, росли надои и накосы, и только «временные трудности» 2011 года подпортили общую благостную картину. Теперь всем обещают снова по $ 500 и сытую жизнь к концу года.

Однако так ли хороши будут эти $ 500 по сравнению с теми, которые были в недалёком 2009 году? Onliner.by решил посчитать, чего и сколько средний белорус мог себе позволить на $ 500 тогда и сейчас.

Если бы вдруг захотелось впрок закупиться на все $ 500 мясом, то в 2009 году можно было «утянуть» 120 кг говядины первой категории по цене $ 4,17/кг. Сегодня же удастся взять всего 78 кило при цене $ 6,41/кг. Даже к белорусскому салу инфляция оказалась беспощадна: если в июне 2009-го его можно было приобрести за $ 4,59/кг, то в июне нынешнего года оно стоило уже $ 5,74/кг. В пересчёте на живую рыбу заветные $ 500 также «исхудали»: с 234 кг в 2009-м до 174 кг в 2012-м. Такие данные можно обнаружить, исследуя средние цены на продукты питания, приводимые в отчётах Белстата.

Насколько в итоге $ 500 образца 2009 года отличаются от $ 500 образца 2012-го, каждый может оценить сам. Однако нужно иметь в виду, что среднюю зарплату в $ 500 в Беларуси обещают к концу года, а какие к тому моменту будут цены на товары и услуги, вряд ли знают даже в Минэкономики.

ЦЕНЫ ВЫРВАЛИСЬ ИЗ ПОД КОНТРОЛЯ

Если верить отделу идеологии Климовичского райисполкома, то экономическая ситуация в стране улучшается. По уверениям идеологов, она характеризуется существенным замедлением инфляционных процессов. Говоря проще, цены замедлили свой рост. Но что мы наблюдаем в действительности? Достаточно зайти на сайт Климовичского райисполкома и почитать размещённые там Новости республики. Вот несколько заголовков: «В Беларуси с 15 июля повышаются на 10% отпускные цены на хлеб и батоны», «Тарифы на перевозки пассажиров местными и пригородными поездами в Беларуси с 12 июля повышаются на 20%», «Тарифы на ЖКУ в Беларуси до конца года планируется повысить». Похоже, что «замедление» перешло в разбег.



ЛАРЫН: «ВАША ЗМАГАННЕ СПРАВЯДЛІВАЕ»

Пераможца «Еўрабачання» сустрэлася з жонкай палітвязня Алеся Бяляцкага

Шведская спявачка Ларын, пераможца сёлетняга "Еўрабачання", выступіла ў Віцебску на «Славянскім базары». Як паведаляе Радыё Свабода, пасля свайго выступу яна сустрэлася з жонкай палітвязня Алеся Бяляцкага Наталляй Пінчук і незалежнымі беларускімі журналістамі.



Ларын больш за дзве гадзіны гутарыла з Наталляй Пінчук. Яна падрабязна цікавілася ўмовамі ўтрымання Бяляцкага ў турме, колькасцю беларускіх палітвязняў, станам захавання правоў чалавека, свабодай выказванняў у Беларусі.

У Наталлі Пінчук яна падрабязна распытвала пра справу Бяляцкага і жыццё сям'і пасля арышту. Спявачка выказала словы падтрымкі Алесю Бяляцкаму і іншым беларускім палітзняволеным, падпісалася пад петыцыяй аб забароне смяротнага пакарання ў Беларусі.

Наталля Пінчук распавядала ёй: «Ужо хутка, праз 20 дзён, будзе год, як Алесь у зняволенні. Гэты год быў цяжкі. Зараз ён у Бабруйскай калоніі, яму створаныя даволі цяжкія маральна-псыхалягічныя ўмовы».

Выслухаўшы Наталлю, Ларын назвала яе «вельмі моцнай жанчынай»:

«Я разумею, чаму Алесь вас кахае… Я вельмі спадзяюся, што ўсё наладзіцца, што яго як найхутчэй выпусцяць, жадаю гэтага ад шчырага сэрца. Вельмі шкада, што такая цудоўная сям'я разлучаная, сын у адным месцы, маці ў другім, а бацька ў турме. Але ваша змаганне справядлівае».

Ларын распавяла, што яна шмат даведалася пра Беларусь ад шведскай праваабаронцаў, а таксама ад сваіх фанаў, якія пісалі ёй пра Беларусь у сацыяльных сетках:

«Я была шчаслівая даведацца, што ёсць так шмат людзей, якія хочуць дапамагчы, якія могуць дапамагчы. Ім толькі патрэбная інфармацыя пра тое, што адбываецца ў Беларусі, і пра тое, якім чынам яны могуць паспрыяць ёй»

Ларын распавяла, што ў яе не было страху перад прыездам у Беларусь.

Яна сама родам з Марока, бачыла беднасць, карупцыю, парушэнне правоў чалавека, розныя магчымасці для мужчын і жанчын. Атрымаўшы запрашэнне выступіць у Віцебску на «Славянскім базары», Ларын усё ж доўга думала, ці ехаць у краіну, дзе парушаюцца правы чалавека. Але выбар зрабіла на карысць аматараў яе творчасці:

«Тут ёсць людзі, якім падабаецца мая музыка. Калі б я не прыехала, гэта было б непавагай да іх. Таму я і прыехала выступіць з гэтай сцэны, каб падзяліцца тым, што маю. А па-другое, я прыехала, каб выказаць сваю думку, таму што я вольны чалавек, і я гэта раблю».

Ларын з ахвотай падпісалася пад петыцыяй з заклікам скасаваць смяротнае пакаранне ў Беларусі. Яна сардэчна абняла Наталлю Пінчук, выказала шмат цёплых пажаданняў беларусам, і перш за ўсё — свабоды.

БУДУЦЬ ШТРАФАВАЦЬ ЗА НЕЗАКОННАЕ ПРАВЯДЗЕННЕ АПЫТАННЯЎ ГРАМАДСКАЙ ДУМКІ

Сяргей КАРАЛЕВІЧ, БелаПАН

Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях будзе дапоўнены артыкулам, які прадугледжвае адказнасць за незаконнае правядзенне апытанняў грамадскай думкі. Адпаведныя папраўкі ў КоАП 29 чэрвеня прынялі дэпутаты палаты прадстаўнікоў у першым чытанні.

У адпаведнасці з законапраектам правядзенне даследаванняў і апублікаванне вынікаў апытанняў грамадскай думкі, што адносяцца да грамадска-палітычнай сітуацыі ў краіне, рэспубліканскіх рэферэндумаў, прэзідэнцкіх і парламенцкіх выбараў, без атрымання адпаведнай акрэдытацыі будзе мець вынікам накладанне штрафу ў памеры да 20 базавых велічынь, а на юрыдычную асобу — да 100 базавых велічынь (10 млн рублёў).

Тое ж дзеянне, учыненае паўторна на працягу аднаго года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання, будзе цягнуць накладанне штрафу ад 10 да 50 базавых велічынь, а на юрыдычную асобу — ад 20 да 200 базавых велічынь (20 млн рублёў).

У МАЛДОВЕ ЗАБАРАНІЛІ САВЕЦКУЮ СІМВОЛІКУ



Парламент краіны прыняў закон, у адпаведнасці з якім савецкія флаг і серп з молатам акажуцца па-за законам як «сімвалы таталітарнага рэжыму». За іх выкарыстанне будзе пагражаць штраф. Нацысцкая і фашысцкая сімволіка таксама забароненыя ў Малдове.

Лідар Ліберальнай партыі Міхай Гімпу падкрэсліў, што ані слова «камуніст», ані Камуністычная партыя пад закон не падпадаюць. Санкцыі адносяцца толькі да сімволікі савецкай дзяржавы. Малдову Савецкі Саюз далучыў у 1940 годзе, у выніку пакта Молатава-Рыбентропа. Як і ў іншых акупаваных краінах, у Малдове савецкія ўлады паслядоўна вынішчылі нацыянальныя эліты, заможныя слаі насельніцтва і бізнэсоўцаў.



ЗАЎСЁДНАЯ РАДАСЦЬ СУСТРЭЧ

Павел КАВАЛЁЎ

Сярод пісьменнікаў Клімаўшчыны самым вядомым лічыцца Павел Пруднікаў. На карысць гэтага сведчаць ягоныя творчыя здабыткі і няпросты жыццёвы шлях. Сёння, да дня нараджэння нашага земляка (нарадзіўся 14 ліпеня 1911 г.), мы друкуем урывак з успамінаў дзеяча Саюза пісьменнікаў БССР П.Н. Кавалёва. У іх апавядаецца пра тое, якую вырашальную ролю адыграў у лёсе Паўла Праднікава класік беларускай літаратуры Іван Мележ. Успаміны былі напісаны ў 1978 годзе.

Пагаварыць з ім было прыемна. І на любую тэму. Іван Паўлавіч умеў сцісла выказваць свае думкі і любіў субяседніка слухаць. Як адзін з кіраўнікоў Саюза Мележ быў уважлівы да ўсіх пісьменнікаў, асабліва да старэйшага пакалення. У мяне, у прыватнасці, ён даведаўся пра тых, каго менш ведаў:

— Ты старэйшы за мяне, — казаў ён, — што ведаеш пра... — і называў прозвішча таго ці іншага з паэтаў ці празаікаў, якія ў свой час былі незаслужана пакараны, а цяпер апраўданы, прыехалі ў Мінск і друкуюцца.

Я, вядома, усё, што ведаў, гаварыў Івану Паўлавічу, а ён, выслухаўшы адказ, нейкі час сядзеў маўклівы і задуменны. Відно было, што людское гора, пісьменніцкую бяду ён успрымаў пакутліва.

Распытваў ён мяне і пра калектывізацыю ў Клімавіцкім раёне. Гаворка гэтая была самай бадай што працяглай. Вяртаўся да яе Іван Паўлавіч і яшчэ некалькі разоў. Нават пасля выхаду рамана "Подых навальніцы".

А аднойчы зайшла гаворка пра старэйшага паэта-клімавічаніна Паўлюка Пруднікава.

— Дык ён твой зямляк? — спытаў Іван Паўлавіч.

— З суседняй вёскі, — адказаў я і расказаў Мележу пра тое, што Пруднікаў і друкавацца і выдавацца пачаў яшчэ задоўга да вайны, і што пакараны ён быў зусім незаслужана, і што доўгі час працаваў настаўнікам. Усё, што ведаў, расказаў. А тады узяў нумар аднаго з часопісаў і прачытаў яму невялікі верш паэта.

— Дык жа што мне рабіць? — раптам пытае Іван Паўлавіч.

І я адразу здагадаўся, чаму пісьменнік-Чалавек пачаў са мною такую гаворку. Ён жа быў старшынёю камісіі па прыёму ў члены Саюза пісьменнікаў. А Пруднікаў да вайны не быў яшчэ членам Саюза і вось падаў заяву, каб яго прынялі. Некаторыя з членаў камісіі выказаліся супраць прыёму ў Саюз Праднікава і некаторых іншых таварышаў. І я тады, як мог, шчыра і нават з хваляваннем выказаў сваю думку пра тое, што трэба людзей, пакрыўджаных лёсам, усяляк падтрымаць і яны яшчэ зробяць нешта для літаратуры.

Іван Паўлавіч доўга глядзеў на мяне. Колькі хвілін маўчаў. Відно было, што ён з нечым пагаджаўся, але не спяшаўся выказвацца.

Праз колькі дзён мне стала вядома, што Мележ выступіў на пасяджэнні камісіі па прыёму ў Саюз пісьменнікаў з вельмі аргументаванай прамовай і падтрымаў кандыдатуру не аднаго Паўла Праднікава.

ЗАСНАВАЛЬНІК "БЕЛАРУСКАГА ЎСХОДУ"

Алена ПАЛЯКОВА

На хвалях аўтарытэтнага незалежнага Радыё Свабода прагучала перадача, прысвечаная хоцімскаму журналісту Васілю Даўгалёву. Вядучы перадачы Вячаслаў Ракіцкі, нагадаў слухачам, што ў вёсцы Маркаўка Хоцімскага раёну з 1991 па 2002 год журналіст Васіль Даўгалёў выдаваў незалежную газету «Беларускі ўсход». Газета была штотыднёвай і стаяла на пазіцыях незалежнасці Беларусі і дэмакратыі, з'яўлялася адным з самых папулярных рэгіянальных недзяржаўных выданняў. Яе чыталі жыхары Хоцімскага, Краснапольскага, Крычаўскага, Клімавіцкага раёнаў, падпісваліся ў Магілёве. Наклад беларускамоўнага дэмакратычнага выдання вагаўся ад 5 да 10 тысяч асобнікаў. Такім чынам, імя выдаўца Васіля Даўгалёва сталася шырока вядомым у нацыянальна-дэмакратычным асяроддзі Беларусі.

Гісторыя газеты распачалася наступным чынам: "Пасьля паразы ГКЧП рэдакцыя хоцімскай раёнкі «Шлях кастрычніка» вырашыла змяніць назву на «Беларускі ўсход», але райвыканкам з гэтым не пагадзіўся. Тады намеснік галоўнага рэдактара Васіль Даўгалёў паехаў у Мінск і зарэгістраваў (у той час гэта было няцяжка) новае выданне, заснавальнікамі якога выступілі хоцімская Свята-Троіцкая царква і саўгас «Трасціно». Першы нумар «нацыянальнай дэмакратычнай газеты», як пісалася на тытуле побач з дэвізам «Жыве Беларусь!», выйшаў 28 снежня 1991 году. Праіснавала газета дзесяць гадоў — да 14 лютага 2002 году.


Беларускі ўсход
Слова да чытача

Уся рэдакцыя складалася з двух чалавек — самога Васіля Даўгалёва і бухгальтаркі. Пісаў аўтар і рэдактар пераважна ад рукі ці на машынцы, кампутарам так і не навучыўся карыстацца. А затым Даўгалёў вёз рукапісы ў Магілёў, дзе газета і друкавалася.

«Ён рабіў сваю справу і даваў прыклад іншым, што і ў нашых умовах чалавеку можна быць свабодным, — кажа Сяргей Аржанцаў, журналіст з Клімавічаў, — Тым болей, што ён ужо быў у сталым узросце, але здолеў рабіць газету ў няпростых умовах. Да яго таксама ж міліцыя прыязджала і спрабавала адабраць кампутары. Ягоны прыклад найперш быў паказальным для асобаў, падобных да яго, што можна нешта рабіць. Калі ў яго атрымліваецца, дык і мы здолеем».

Памёр Васіль Даўгалёў 28 лютага 2002 году, не дажыўшы два тыдні да свайго сямідзесяцігоддзя. Ён працаваў над 188-м нумарам газеты. Яго пахавалі на вясковых могілках у Маркаўцы. Будзем памятаць пра добрага чалавека і сумленнага журналіста.



ПАСПОРТ. АМЕРИКА

Владимир ПОЗНЕР, echo.msk.ru



Я прилетел из Москвы в Нью-Йорк. Прошёл паспортный контроль. Поехал в гостиницу и обнаружил, что паспорта нет. То ли его украли, то ли я его выронил, но факт оставался фактом: паспорт пропал.

На следующее утро, ровно в девять, я позвонил в Паспортный центр города Нью-Йорка. Как ни старался, я не смог добиться живого человеческого голоса, а бесконечная запись не разъясняла, как мне поступить. И я поехал.

Центр этот тоже находится в нижней части острова и выглядит столь же безлико, как тот, в котором я получил гражданство. У входа стояли двое вооруженных автоматами охранников.

Я подошел и начал: — Я потерял паспорт и хотел бы...

Один из них перебил меня: — Прямо, налево по коридору, белое окошко. В окошке сидела афроамериканка не слишком приветливого вида.

— Я потерял паспорт... — заговорил я, но она тоже перебила: — Белый телефон на стенке справа. И в самом деле, на стене висел белый телефон, а рядом с ним, за прозрачной пластмассовой защитой, была прикреплена инструкция. Начиналась она так:

1. Поднимите трубку. 2. Услышав гудок нажмите цифру "13". Услышав слово "говорите", чётко и ясно изложите свой вопрос..." И так далее.

Таким образом, я получил порядковый номер и время, когда должен подняться на десятый этаж в зал номер такой-то. На часах было 9:30 утра, а встречу мне назначали на 11:00. Я вышел, попил кофе, почитал газету и вернулся без пяти одиннадцать.

— Мой номер такой-то, — сказал я охранникам, которые жестом пригласили меня пройти. Я поднялся на десятый этаж, вошёл в большой зал, часть которого состояла из застеклённых окошек. Не успел я сесть, ровно в одиннадцать раздался голос: "Владимир Познер, окно номер три". Я подошел. Меня поджидал мужчина лет пятидесяти, лицо которого я почему-то запомнил, может, потому что он удивительно походил на Чехова.

— Привет, как дела? — спросил он.

— Да так себе.

— Что случилось?

— Да то ли у меня украли, то ли потерял паспорт.

— Ну, это не беда. Вот вам бланк, заполните его.

Я заполнил и вернул бланк Чехову.

— Та-ак, - протянул он, — вы натурализованный гражданин США?

Я кивнул.

— Это чуть осложняет дело. У вас есть документ, подтверждающий ваше гражданство?

— Есть, но он в Москве, я его не вожу с собой.

— А напрасно. Надо иметь при себе хотя бы ксерокопию.

— Я могу позвонить в Москву и попросить, чтобы прислали мне в гостиницу копию по факсу, получу и вернусь к вам.

— Отлично, буду ждать, — сказал Чехов.

Я тут же позвонил, помчался в гостиницу, где факс уже ждал меня. Схватив его, вернулся в Паспортный центр. В половине первого я подошел к окошку номер 3 и протянул факсимильную копию.

Чехов посмотрел на неё, покачал головой и сказал: — Сэр, мне очень жаль, но я получил разъяснение, что нам нужен оригинал.

— Но оригинал в Москве. Не могу же я лететь туда, не имея паспорта!

— И не надо, сэр, не нервничайте. В Вашингтоне имеется второй оригинал, который нам пришлют. Но эта операция будет стоить вам девяносто долларов.

Я готов был заплатить любую сумму, лишь бы получить паспорт.

— Мистер Познер, — сказал Чехов, вас будут ждать ровно в три часа в зале номер два. Я вышел на улицу, съел хот-дог "со всеми причиндалами" — так говорят, когда на сосиску накладывают все специи и все соусы плюс кетчуп и горчицу. Запил эту гадость бутылкой кока-колы, и без пяти три пришел в зал номер два.

Ровно в три раздался голос: — Мистер ВАЛДИМИР Познер! — Именно так, Валдимир, а не Владимир. Я подошёл к окошку.

Довольно мрачная чёрная женщина протянула мне паспорт и сказала: — Проверьте, всё ли правильно.

В паспорте значилось "Владимир", а не "Валдимир". Всё было правильно.

— Распишитесь в получении.

Я расписался. Время было пять минут четвертого.

Меньше чем за один рабочий день я получил новый паспорт. Признаться, я был потрясен. Я отправился в другой зал, подошёл к окошку, за которым сидел Чехов и сказал:

— Сэр, не могу даже подобрать слова, чтобы выразить вам благодарность за такую работу. Я поражён.

Чехов посмотрел на меня и совершенно серьёзно, я даже бы сказал строго, ответил:

— Сэр, вы за это платите налоги.







МОНАХИ ТОЖЕ СМЕЮТСЯ

Забавные и поучительные истории эпохи раннего христианства

Монах Филимон обнаружил однажды, глядя на весело играющих мальчишек, что весьма недалеко ещё продвинулся по пути совершенства. Он спросил их: — Во что вы играете?

— Мы играем, кто больше всех соврёт.

— Ох, - сказал старец, - в моё время не играли в такие игры!

— Молодец, отче, ты выиграл! - закричали хором ребята.

Однажды епископ посетил монастырь в пустыне. Монахи, жившие там только на хлебе и воде, лезли из кожи вон, чтобы приготовить для епископа подобающую трапезу.

В конце обеда, трепеща, они спросили его:

— Владыка, как ты нашёл нашу козлятину?

— Случайно, под листиком салата, - отвечал епископ.

Один старец как-то возмущался:

— Не понимаю, зачем в монастыре расписание, если монахи всё время опаздывают?

Игумен ему ответил:

— А как бы ты узнал, что монахи опаздывают, если бы не было расписания?

Много проживший старец сказал по поводу женщин: «Я помню, что прежде женщины, смущаясь, краснели. А теперь они смущаются, если покраснеют». Он же заметил: «Всё в жизни происходит так: когда вы становитесь достаточно большим, чтобы дотянуться до горшочка с медом, вам этого уже не хочется».

ШТРАФ ДЛЯ «ЗАЙЦОЎ» ПАДВЫСІЦЦА ДА 50 ТЫСЯЧ

Напрыканцы чэрвеня Палата прадстаўнікоў у першым чытанні прыняла змены і дапаўненні ў кодэкс «Аб адміністратыўных правапарушэннях».

Як інфармуе Радыё Свабода, згодна з прынятымі папраўкамі, штраф за безбілетны праезд у грамадскім транспарце ў Беларусі ўзрастае з 0,2 базавай велічыні да 0,5. Гэта азначае, што пры цяперашнім памеры базавай велічыні ў 100 тысяч беларускіх рублёў безбілетнік павінен будзе заплаціць штраф у 50 тысяч.

Такое падвышэнне выклікане тым, што колькасць «зайцоў» у грамадскім транспарце за апошнія гады значна вырасла. Напрыклад, у 2006 годзе па ўсёй Беларусі было аштрафавана 38,7 тысячы безбілетнікаў, а ў 2010 годзе — ужо 158,7 тысячы.

АЛИМЕНТЫ НА ДЕТЕЙ ПРИВЯЖУТ К СРЕДНЕЙ ЗАРПЛАТЕ ПО СТРАНЕ

С 24 июля в силу вступают изменения и дополнения, которые были внесены в Кодекс о браке и семье, корректировка коснулась 120-ти статьей! Что изменится в ближайшее время, «Комсомольская правда в Белоруссии» поинтересовалась у адвоката юридической консультации Октябрьского района столицы Дмитрия Ивановского.

Самый больной вопрос для многих семей — алименты. Одно дело, если папа или мама высылают каждый месяц деньги собственному ребенку, но есть и те, кто бегает от алиментов как от огня.


Именно должников и коснутся нововведения. Если раньше они не работали, то размер алиментов устанавливался исходя из средней зарплаты определённого региона. Теперь будет учитываться зарплата по стране.

Понятно, что родители, которые живут в Минске, потеряют в деньгах: ведь заработная плата в столице и в провинции существенно отличается. Но зато выиграют все остальные.

ONCOPATIENT.BY — СООБЩЕСТВО ОНКОЛОГИЧЕСКИХ ПАЦИЕНТОВ И ИХ ДРУЗЕЙ

В интернете появился сайт Oncopatient.by. Он создан активистами, волонтёрами и единомышленниками общественного объединения «Белорусская организация трудящихся женщин».

Oncopatient.by создан теми, кому был поставлен диагноз "рак", а также родными и близкими онкобольных. В разделе "Личные истории" начата летопись автобиографических историй людей, которые знают, зачем они борются против онкологических заболеваний, какие усилия приходится прикладывать и препятствия преодолевать, чтобы начать полноценную жизнь. В разделе "Мероприятия" представлена информация о гражданских инициативах, некоммерческих организациях и социально-ориентированных бизнес-компаниях, чья работа направленной на борьбу против рака в Беларуси. Зайдя в раздел "Библиотека", можно ознакомиться с исследованиями, публикациями, книгами, аудио и видео материалами на онкологическую и близкую к ней тематику. Тёплые слова в адрес тех, кто внимательно лечит, искренне поддерживает, чутко сопровождает — в разделе "Благодарности".



КЛІМАВІЦКАЯ ІНФА-ПАНАРАМА

Клімавіцкі грамадска-палітычны бюлетэнь
Адказны за выпуск: Аржанцаў Сяргей Юр'евіч
Адрас: Клімавічы, вул. Леніна, д. 27а, кв.15.
Надрукавана на ўласным абсталяванні. Наклад 299 асобнікаў
Распаўсюджваецца бясплатна